## ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА: ЛЮДЗІ – ПАДЗЕІ – ФАКТЫ

**Т. М. Агеенка**

# ДАКУМЕНТЫ БШПР ЯК БІЯГРАФІЧНЫЯ КРЫНІЦЫ

Павелічэнне цікавасці да вывучэння гісторыі сям'і, канкрэтных асоб, што пражывалі на тэрыторыі Беларусі, прыводзіць да пашырэння кола крыніц, якія неабходны для пошуку інфармацыі. Калі раней дакументы партызанскіх і падпольных арганізацый выкарыстоўвалі для пацвярджэння факта ўдзелу ў руху супраціву, пошуку месцазнаходжання загінуўшых у межах сацыяльна-прававых запытаў, то апошнія дваццаць гадоў інтарэс да гэтых крыніц усё больш павялічваецца менавіта з боку грамадзян, якія шукаюць звесткі пра сваіх продкаў. Пры правядзенні пошуку інфармацыі цэнтральнае месца займаюць дакументы Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР), што захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Варта адзначыць, што пачынаючы з 2017 г. НАРБам сумесна з выдавецкім домам «Беларусь сегодня» праводзіцца праца па алічбоўцы і прадстаўленні ў адкрытым доступе дакументаў асабовага складу на партызан і падпольшчыкаў з фонду БШПР (Ф. 1450). Гэта дазваляе ўсім жадаючым з любой кропкі свету і ў любы час знайсці звесткі аб продках – удзельніках партызанскага руху і падполля.

Улічваючы вялікі аб'ём фонду БШПР (11 152 адзінкі захоўвання, змешчаныя ў 23 вопісах), першапачаткова было прынята рашэнне пачаць алічбоўку ўзнагародных дакументаў (Ф. 1450. Воп. 15, 19), прадстаўленых загадамі і ўзнагароднымі лістамі на званне Героя Савецкага Саюза; ордэны: Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны, Чырвонай Зоркі, Славы; медалі: «За адвагу», «За баявыя заслугі», «Партызану Айчыннай вайны» за верасень 1943 г. – снежань 1948 г. Узнагародныя лісты аформлены на тыпаграфскіх бланках ці чыстых аркушах, часта запоўненыя ад рукі, сустракаюцца як ў арыгіналах, так і копіях. Яны ўтрымліваюць наступныя звесткі: прозвішча, імя, імя па бацьку; званне; пасада; да якой узнагароды прадстаўлены; год нараджэння; нацыянальнасць; партыйнасць; удзел у грамадзянскай вайне, далейшых баявых дзеяннях па абароне СССР і айчыннай вайне; звесткі аб раненнях і кантузіях; час уступлення ў Чырвоную армію (РВК, якім прызваны) і партызанскі атрад; даныя аб узнагародах; адрас месца нараджэння і сям'і; кароткае апісанне баявога подзвігу ці заслуг.

Акрамя вышэй адзначаных дакументаў узнагароджаных, алічбаваны і прадстаўлены на сайце ўзнагародныя лісты, адхіленых ад узнагароджання, а таксама перапіска па гэтым пытанні. Апошнія ў некаторых выпадках праліваюць святло на падрабязнасці жыцця ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Напрыклад, чырвонаармеец М. І. Ішэнка ў жніўні 1946 г. пісаў: «Находясь в гостях 1 Московско-Минской дивизии я узнал, что вы мне должны выдать награду "Медаль партизана" я узнал ваш адрес и хочу точно узнать можно ли

ее получить. Как я вам уже писал. Сейчас еще хочу обрисовать картину моих действий в вашей бригаде. Перед прорывом под г. Орша за 20 дней нас командование послало на выполнение боевой задачи. Ночью сели в самолет и вылетели за гор. Минск и там мы были выброшены на парашютах, но на пути мы встретились с партизанами отряда “Большевик” но мы стали действовать совместно с ними в разведчиках после взятия г. Минска я обратно ушел в свою дивизию. Совместно с этим я был ранен но по прибытию в свою часть. Я лечился в своем самбате…» [1]. На дакуменце стаіць рэзалюцыя: «В нагр. и предст. не значится».

Замаўляючы ўзнагародныя дакументы ў архіве, даследчыкі адразу па загалоўках бачаць назву справы, дзе пазначана дата і нумар указа ці загад начальніка БШПР, у шэрагу выпадкаў прадстаўлены загады аб узнагароджанні. У той жа час інфармацыя аб гэтым часта адсутнічае ў матэрыялах, змешчаных на сайце (выключэнне складаюць дакументы, на якіх прастаўлены штамп (ці ёсць рукапісная памета) з указаннем чым і калі ўзнагароджаны чалавек). Працуючы з гэтай катэгорыяй дакументаў анлайн, важна памятаць, што нярэдка чалавека прадстаўлялі да адной узнагароды, а ўзнагароджвалі іншай. Так, напрыклад, М. М. Джагараў, камісар 1-й Мінскай партызанскай брыгады, у ліпені 1944 г. быў прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза, і толькі ў снежні 1948 г. ён атрымаў ордэн Айчыннай вайны І ступені [2]. У яго электроннай картцы ў раздзеле «Узнагароды» ўказання на гэты ордэн няма, а толькі ў раздзеле «Прадстаўлены да ўзнагароды». Такім чынам, неабходна, на нашу думку, у адносінах да ўзнагародных дакументаў пазначэнне архіўных шыфраў.

Для распрацоўшчыкаў сайта «Партызаны Беларусі» важным з’яўляецца ўстанаўленне дакладнай колькасці ўдзельнікаў партызанскага руху і падполля на тэрыторыі Беларусі (аб чым сведчыць лічба на галоўнай старонцы сайта – 400 000). Разважаючы над пытаннем аб тым, наколькі гэта магчыма, трэба ўлічваць той факт, што ўзнагарод па лініі БШПР былі ўдастоены як непасрэдныя ўдзельнікі руху супраціву, члены спецгруп НКДБ–НКУС СССР і БССР, якія не падпарадкоўваліся БШПР, партызанскіх злучэнняў, што толькі праводзілі рэйды на тэрыторыі Беларусі і ўваходзілі ў іншыя партызанскія штабы, так і лётчыкі, механікі, супрацоўнікі БШПР, ЦК КП(б)Б, райкамаў і абкамаў КП(б)Б, фатографы, кінамеханікі і кінаапаратары, дыктары радыёвяшчання, чырвонаармейцы і інш. Многія з іх непасрэдна не прымалі ўдзел у партызанскім руху і падполлі і нават былі ў глыбокім тыле. Напрыклад, на сайце прысутнічае картка на Ф. В. Папова, дырэктара партархіва ЦК КП(б)Б. Ва ўзнагародным лісце на яго запісана: «В годы Великой Отечественной войны был постоянным уполномоченным ЦК КП(б) Белоруссии в Башкирской АССР по отбору кадров для спецшкол партизанского движения. Вместе с этим будучи заведующим Партархивом ЦК КП(б)Б, он проводил разработку документов и материалов подпольных партийных и комсомольских организаций, партизанских бригад и отрядов, получаемых с занятой немцами территории Белоруссии» [3]. Такім чынам, можна выка-

заць меркаванне, што атрымаць дакладную лічбу партызан і падпольшчыкаў не атрымаецца. У той жа час узнагародныя дакументы дапамагаюць паглядзець на партызанскі рух значна шырэй і ўбачыць, што эфектыўнасць яго барацьбы залежыла не толькі ад непасрэдных баявых дзеянняў у тыле ворага, але і ад зладжанай працы канкрэтных людзей у савецкім тыле па кіраванні, снабжэнні, абслугоўванні і інш. тых, хто змагаўся з нацызмам.

Сярод дакументаў БШПР, што размешчаны на сайце, вялікую частку займаюць асабовыя лісткі па ўліку партызанскіх кадраў на радавы і сяржанскі склад (Ф. 1450. Воп. 7). Яны афармлены часцей за ўсё на тыпаграфскіх бланках і запоўнены ад рукі. Утрымліваюць звесткі: прозвішча, імя, імя па бацьку; год і месца нараджэння; нацыянальнасць; сацыяльнае становішча; час уступлення ва УКП(б) ці УЛКСМ; адукацыя; якім РВК і калі прызваны ў Чырвоную армію, удзел на франтах; адкуль, калі і з якой пасады прыбыў у партызанскі атрад; ці быў у палоне; у якіх партызанскіх атрадах (групах) знаходзіўся і раён іх дзейнасці; раненні і кантузіі; узнагароды; сямейнае становішча; баявая характарыстыка. Шукаючы даныя ў гэтых дакументах, варта ўлічваць, што яны маюцца не на ўсіх. Большасць датуецца 1944 г. (запаўняліся пасля злучэння партызанскіх фарміраванняў з часткамі Чырвонай арміі) і нават пазнейшымі гадамі. Такім чынам, на ўдзельнікаў партызанскіх фарміраванняў 1941–1942 гг., а таксама многіх загінуўшых у 1941–1943 гг., накіраваных ў савецкі тыл, асабовыя лісткі не афармляліся.

Яшчэ адной крыніцай напаўнення сайта з’яўляюцца асабовыя справы на камандны склад (Ф. 1450. Воп. 8), якія ўтрымліваюць дакументы за 1942–1967 гг., аформленыя як на бланках, так і ў адвольнай форме, запоўненыя ад рукі. Амаль на кожнага маецца асабовы лісток па ўліку партызанскіх кадраў, які змяшчае звесткі: прозвішча, імя, імя па бацьку; воінскае званне; год і месяц нараджэння, месца нараджэння; нацыянальнасць; сацыяльнае палажэнне; прафесія і паходжанне; занятак бацькоў; час уступлення ва УКП(б), звесткі аб выбыцці з УКП(б), знаходжанні ў іншых партыях; адукацыя; валоданне замежнымі мовамі; звесткі аб выездах за мяжу, наяўнасці там сваякоў; судзімасць; час уступлення ў Чырвоную армію; удзел у грамадзянскай і айчыннай вайне; знаходжанне на акупаванай тэрыторыі, у палоне; раненні, кантузіі; узнагароды; сямейнае становішча. Тут жа каротка прадстаўлены звесткі аб працы ў мінулым і аўтабіяграфія. Таксама ў справах могуць прысутнічаць даведкі, атэстацыйныя лісты, характарыстыкі, перапіска.

Размешчаны на сайце і асабовыя справы на радыстаў (Ф. 1450. Воп. 10), часта яны адпавядаюць дакументам на камандны склад: асабовыя лісткі з аўтабіяграфіямі, атэстацыйныя лісты і інш., у некаторых справах сустракаюцца фотаздымкі.

Інфармацыя на загінуўшых прадстаўлена копіямі паведамленняў аб гібелі партызан (Ф. 1450. Воп. 11), якія змяшчаюць звесткі: каму дасылаецца і на які адрас; прозвішча, імя, імя па бацьку загінуўшага, год нараджэння, пасада ў партызанскім атрадзе, апошняе месца працы і пасада, калі загінуў і дзе пахаваны.

Апошнім часам на сайт пачалі дадаваць матэрыялы грамадзян, прызнаных удзельнікамі партызанскага і падпольнага руху ў пасляваенны перыяд (Ф. 1450. Воп. 5, 6). Стандартны набор дакументаў уключае: асабовы лісток па ўліку партызанскіх кадраў, заяву (на тых, хто загінуў падчас вайны дакументы запаўнялі сваякі), даведкі, пацвярджэнні, выпіскі з пратаколаў. З гэтых матэрыялаў таксама можна пачарпнуць карысную інфармацыю. Напрыклад, у заяве аб прызнанні ўдзельніцай партызанскага руху К. Д. Тарасенка, якая загінула ў красавіку 1944 г., яе бацька, Д. А. Тарасенка пісаў: «24-го апреля 1944 года моя дочь Тарасенко Клавдия Дмитриевна убита немецкими войсками за связь с партизанами бригады "Дубова" каковую она действительно имела и выполняла непосредственно задания командования бригады. Штаб бригады в тот период времени был размещен в дер. Заборье лично в моей квартире т.е. у отца убитой моей дочери Тарасенко Дмитрия Афанасьевича…» [4].

Працуючы з матэрыяламі сайта, можна сутыкнуцца і з шэрагам праблем. Напрыклад, пры правядзенні пашыранага пошуку па катэгорыі «пасада ў атрадзе» для тых, у каго яна адсутнічае, прадстаўляецца як мінімум 1000 такіх картак. Прычым у большасці дакументаў, прымацаваных да такіх картак, пасада прысутнічае. Такім чынам, для таго, каб мець магчымасць праводзіць статыстычны аналіз па матэрыялах сайта, неабходна правесці зверку даных, вынесеных ў электронную картку, з тым, што ўказана ў лічбавым вобразе архіўнага дакумента. Акрамя таго, сустракаюцца выпадкі, калі на аднаго партызана створана некалькі картак, гэта таксама патрабуе адсочвання. Напрыклад, на Агеенка Мікалая з в. Забор'е іх дзве, нягледзячы на тое, што год нараджэння, месца нараджэння, партызанскі атрад і брыгада адна і тая ж, розніца толькі ў тым, што ва ўзнагародным лісце ён указаны як Мікалай В. [5], а ў асабовым лістку як Мікалай Васільевіч [6].

Вяртаючыся да пытання аб агульнай колькасці ўдзельнікаў руху супраціву, нагадаем, што вызначыць яе не атрымаецца, пакуль не будуць размешчаны асноўныя спісы на партызан (Ф. 1450. Воп. 5, 6). Бо, як ужо адзначалася вышэй, не на ўсіх былі заведзены асабовыя карткі і не ўсе былі ўзнагароджаны. Гэтыя ж спісы складаліся як на жывых, так і на загінуўшых на працягу 1942–1944 гг. некалькі разоў. Спісы ўтрымліваюць графы: прозвішча, імя, імя па бацьку; год і месца нараджэння; партыйнасць; адукацыя; звесткі аб уступленні ў Чырвоную армію, партызанскі атрад; узнагароды; воінскае званне; знаходжанне ў палоне; пасада ў атрадзе; адкуль прыбыў у партызаны; адрас сям'і; на загінуўшых – дата і месца гібелі, месца пахавання. Большасць спісаў уяўляе рукапісны тэкст, звесткі пра чалавека займаюць адзін радок.

На сайце «Партызаны Беларусі» недастаткова прадстаўлены звесткі аб удзельніках падпольных арганізацый, нават у полі «пасада ў атрадзе» адсутнічае катэгорыя «падпольшчык» ці «член падпольнай групы» (аднак прысутнічае «член падпольнага камітэта», «кіраўнік падпольнай групы»). Дакументы на членаў падпольных груп змешчаны ў шматлікіх фондах партыйных,

камсамольскіх органаў і партыйна-камсамольскіх груп, што дзейнічалі на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Яны ўтрымліваюць спісы ўдзельнікаў, даведкі, характарыстыкі, асабовыя лісты, пратаколы і выпіскі з пратаколаў аб прызнанні людзей удзельнікамі падпольных груп і інш. за 1942–2001 гг.

Такім чынам, дакументы фонда БШПР утрымліваюць базавую інфармацыю як аб удзельніках руху супраціву на тэрыторыі Беларусі (звесткі пра чалавека, яго сям'ю, удзеле ў Вялікай Айчыннай вайне ў якасці чырвонаармейца і партызана / падпольшчыка і інш.), так і аб усіх, хто быў узнагароджаны па лініі БШПР і садзейнічаў хутчэйшаму вызваленню краіны ад нацысцкіх захопнікаў. У меншай ступені ў фондзе прадстаўлены звесткі аб удзельніках падпольных арганізацый. Большая частка асабовых дакументаў БШПР ужо размешчана на сайце «Партызаны Беларусі». Варта адзначыць, што нягледзячы на шэраг памылак і недакладнасцяў, якія прысутнічаюць у электронных картках, матэрыялы сайта значна палягчаюць пошук звестак персанальнага характару і спрыяюць папулярызацыі гісторыі партызанскай барацьбы на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

## ЛІТАРАТУРА

1. Ішэнка Мікалай Іванавіч // Партызаны Беларусі. – URL: https://partizany.by/partisans/106494/ (дата звароту: 01.04.2024).

2. Джагараў Міхаіл Міхайлавіч // Партызаны Беларусі. – URL: https://partizany.by/partisans/24142/ (дата звароту: 01.04.2024).

3. Папоў Фёдар Восіпавіч // Партызаны Беларусі. – URL: https://partizany.by/partisans/93539// (дата звароту: 01.04.2024).

4. Тарасенка Клаўдзія Дзмітрыеўна // Партызаны Беларусі. – URL: https://partizany.by/partisans/242346/ (дата звароту: 01.04.2024).

5. Агеенка Мікалай // Партызаны Беларусі. – URL: https://partizany.by/partisans/102197/ (дата звароту: 01.04.2024).

6. Агеенка Мікалай Васільевіч // Партызаны Беларусі. – URL: https://partizany.by/partisans/134777/ (дата звароту: 01.04.2024).